# АНАНІМНАСЦЬ МЕДЫЯ ЯК ПРАЯВА КРЫЗІСУ КУЛЬТУРЫ ДАВЕРУ

**А. Д. Крывалап**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск, Беларусь
E-mail: 2krivolap@gmail.com

Тэкст прысвечаны разгляду феномена крызісу культуры даверу, які праяўляецца ў розных формах, але адна з іх – гэта адсутнасць даверу да традыцыйных медыя і рост папулярнасці ананімных крыніц камунікацыі. Мэтай даследавання з'яўляецца спроба зразумець механізмы і заканамернасці дадзенага працэсу. Вынікі прадстаўленага даследавання могуць быць цікавы як стваральнікам традыцыйных медыя, так і спажыўцам новых медыя ва ўмовах глабалізацыі.

*Ключавыя словы*: культура даверу; ананімнасць; сацыяльная камунікацыя; ідэнтычнасць; практыка.

# ANONYMITY MEDIA AS A MANIFESTATION OF A CULTURE OF TRUST CRISIS

**A. D. Krivolap**

Belarusian State University of Culture and Arts,
Rabkorovskaya str. 17, 220007, Minsk, Republic of Belarus
E-mail: 2krivolap@gmail.com

The text deals with the phenomenon of a culture of trust crisis that manifests itself in various forms, but one of them - is the lack of confidence in the traditional media and the growing popularity of anonymous sources of communication. The aim of the study is an attempt to understand the mechanisms and regularities of this process. Results from this study may be of interest to both traditional media creators and consumers of new media in the context of globalization.

*Key words*: Culture of trust; anonymity; social communication; identity; practice.

Плённая канцэпцыя культуры даверу, якую прапанаваў П. Штомка напрыканцы мінулага стагоддзя, нечакана атрымала сёння другое дыханне. Гэта здарылася пасля таго, як стаў відавочным імклівы рост папулярнасці разнастайных месенджараў, якія дазваляюць захоўваць ананімнасць, але пры гэтым актыўна браць удзел у працэсе камунікацыі. Адказ на актуальнае пытанне – чаму аўдыторыя пераключаецца з традыцыйных медыя на ананімныя тэлеграм-каналы?

– магчыма знайсці ў канцэпцыі П. Штомпкі. Але спачатку неабходна патлумачыць некаторыя тэрміналагічныя адрозненні, якія непазбежна ўзнікаюць, калі мы спрабуем адаптаваць сацыялагічную тэорыю П. Штомпкі да патрэб культуралогіі, каб пазбегнуць блытаніны і выпадковых памылак. Так, адзін са сваіх тэкстаў, які закранае пытанні сацыяльнага станаўлення, П. Штомпка прысвяціў канцэпцыі даверу. На рускую мову гэты тэкст перакладзены як «Доверие – основа общества», і ў ім разглядаецца «культуралагічны паварот у сацыялогіі» [4, с. 46–54]. Аднак праблема ў тым, што П. Штомпа нічога не пісаў пра культуралогію, бо ён у сваім тэксце апісваў менавіта «культуралісткі паварот» (culturalist turn) [1, с. 5–14]. І гэта не проста цяжкасці перакладу з англійскай мовы на рускую. Гэта іншая праблема, якая можа разглядацца ў канцэпцыі розных дыскурсіўных практык. Іншымі словамі, гэта не проста памылка перакладчыка, які пераклаў культуралізм як культуралогію, а нешта іншае.

У сваіх разважаннях П. Штомпка звяртаецца да ідэі Э. Гідэнса пра амбівалентнасць сацыяльных структур і спрабуе паказаць амбівалентны характар культуры. «З аднаго боку, культура дадае дзейнасці аксіалагічную, нарматыўную і гнасеалагічную арыентацыю. З іншага – дзеянні фарміруюць і трансфармуюць культуру, гэтыя дзеянні з’яўляюцца асноўным фактарам утварэння новай культуры ці яе морфагенезу» [4, с. 42–43]. Пры гэтым мы разумеем, што сацыяльныя структуры не выходзяць на вуліцы і з’яўляюцца нябачнымі, але пры гэтым працягваюць існаваць і аказваць уплыў на паводзіны індывідаў. Нават калі мы не можам бачыць сацыяльныя структуры, то гэта не значыць, што іх немагчыма даследаваць таму, што «структуры раскрываюцца ў аперацыях» [2, с. 270]. І ў гэтым таксама магчыма пабачыць дуальнасць агентаў як суб’ектаў дзеяння, калі непасрэдна самі агенты з’яўляецца прадуктам сацыяльный структуры і пэўным рэсурсам для канструявання гэтых самых структур. Як падкрэслівае П. Штомпка, «няма безструктурных агентаў і няма безагентных структур, але ў той жа час структуры не растварающца ў агентах, і агенты не паглынаюцца структурамі» [2, с. 272]. Нешта падобнае мы можам пабачыць на ўзроўні культуры, калі кожны прадстаўнік пэўнай культуры не проста выступае ў ролі яе носьбіту, але і можа выконваць ролю творцы гэтай самай культуры. Няма асобнай рэальнасці агентаў і няма асобнай рэальнасці структур, усё зліта ў адзіную

«фабрыку» па вытворчасці сацыяльнай рэальнасці, культуры, агульнага бачання свету.

У гэтым кантэксце цікава адзначыць спробы П. Штомпкі асэнсаваць місію сацыялогіі ў посткамуністычных грамадствах [3], у якіх разбураны давер да ранейшых сацыяльных інстытутаў «рэальнага сацыялізму» [2, с. 309–311], а да новых сацыяльных утварэнняў ён яшчэ не склаўся. Перад тым як казаць пра давер да новых структур, неабходна ўсвядоміць іх магчымасці і абмежаванні ці, іншымі словамі, «дзеля таго каб у поўнай меры выкарыстоўваць магчымасці дэмакратыі, іх спачатку неабходна ўсвядоміць» [2, с. 281]. Разуменне і тлумачэнне сацыяльных пераўтварэнняў у постсавецкім грамадстве не можа быць рэдукавана да экспарту дэмакратыі, бо грамадству неабходна змяніцца. І гэтыя змены, гэты працэс сацыяльнага станаўлення можа быць здзейснены праз дзве мадэлі: 1) праз інстытуцыялізацыю адхіленняў ад нормы; 2) праз накапленне інавацый. «Калі інавацыі пашанцавала выстаяць, то рашаючае значэнне атрымоўвае яе легітымацыя – у адваротным выпадку існаванне новых норм, каштоўнасцей і інстытутаў ненадзейна» [2, с. 320].

Іншымі словамі, увага і цікаўнасць да ананімных сродкаў камунікацыі ў тым ліку сведчаць і пра крызіс культуры даверу. У П. Штомкі гэты працэс адбываецца паміж культурай даверу і культура цынізму. Культура не можа ўзнікнуць у адно імгненне, як не можа і бясследна знікнуць. Таму гэта працэс, які можа быць апісаны ў тэрмінах сацыяльнага станаўлення. Але асноўная праблема не ў тым, што аўдыторыя цікавіцца незразумелымі ананімнымі каналамі камунікацыі, а ў тым, што яна паступова губляе давер да традыцыйных медыя.

У выніку зробленага тэарэтычнага аналізу, мы прыйшлі да наступных высноў. Мадэль сацыяльнага станаўлення патэнцыяльна можа быць прыдатнай для выкарыстання ў межах культуралогіі, для разумення і тлумачэння трансфармацый у сферы культуры. Мадэль сацыяльнага станаўлення не толькі дазваляе патлумачыць сацыяльныя працэсы на ўзроўні сацыяльных груп, але і прыдатна для выкарыстання для культуралагічных патрэб, а дакладней паказаць, якім чынам сёння адбываюцца змены і трансфармацыі. Кірункам для далейшага даследавання можа быць верыфікацыя дадзенай тэарэтычнай мадэлі сацыяльнага станаўлення на сучасным беларускім эмпірычным матэрыяле.

Практыка сацыяльнага станаўлення як механізм фарміравання культурай ідэнтычнасці па-ранейшаму функцыянуе, але ў ёй з'явіліся новыя абмежаванні і выклікі для яго выкарыстання. Культурна-дэтэрмінаваная практыка сацыяльнага станаўлення мае патрэбу абароне ад навязвання шаблонаў культуралізацыі грамадзянства, калі прыналежнасць да пэўнай культуры вызначаецца не індывідуальнымі практыкамі штодзённасці, а засваеннем «кананічных» рытуальных практык. Выбар лініі паводзін у рэчышчы культуры даверу ці культуры цынізму цалкам залежыць ад уключанасці actoраў у працэсы сацыяльнай камунікацыі.

Бібліяграфічныя спасылкі


1. Sztompka, P. Trust: A Sociological Theory / P. Sztompka, NY : Cambridge Univ. Press, 2003. – 214 с.
2. Штомпка, П. Социология социальных изменений / П. Штомпка. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 416 с.
3. Штомпка, П. Миссия социологии в посткоммунистических обществах / П. Штомпка // Посев. – № 6. – 2006. – С. 4–10.
4. Штомпка, П. Доверие – основа общества / П. Штомпка. – М. : Логос, 2012. – 440 с.


## ПРЕОБРАЗОВАНИЕ КУЛЬТУРЫ ОРГАНИЗАЦИИ ЧЕРЕЗ ROX3


**А. А. Касперук**
Белорусский государственный университет,
факультет социокультурных коммуникаций,
ул. Курчатова, 5, 220108, Минск, Республика Беларусь
E-mail: bekon@tut.by



В статье рассматриваются современные подходы трансформации культуры, отдается приоритет подходу ROX3, предусматривающему интеграцию опыта лидера, опыта персонала и опыта клиентов в культуру и стратегии организации.



*Ключевые слова*: ROX3; опыт; вовлеченность; организационная культура.